Характар старажытнай лепкі складалі раслінныя прымесі ў цесце гліны. З тонкай масы выраблялі вастрадонныя гаршкі з адкрытым верхам. Распаўсюджаны на той час былі вырабы з простым профілем венчыка.

Такім чынам, форма, сілуэт і арнамент гліняных вырабаў адлюстроўваюць пэўныя рысы кожнай з культур, існаваўшых на тэрыторыі сучаснай Беларсі.

**Л.Ф.Голікава,**
*дацэнт*

## ЦАРКОЎНАЯ МУЗЫКА ЯК УВАСАБЛЕННЕ ДУХОЎНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ ДРУГОЙ ЧВЭРЦІ XX ст.

Царкоўная музыка беларускіх кампазітараў да нядаўняга часу амаль не была вядома шырокаму колу слухачоў, хаця шэраг аўтараў (М.Анцаў, А.Туранкоў, М.Куліковіч-Шчаглоў, М.Равенскі, А.Валынчык, А.Карповіч, К.Кіслы, Я.Сямашка, А.Стэповіч, В.Селях-Качанскі і іншыя, якіх можна аднесці да беларускай школы царкоўных кампазітараў) вялікую ўвагу ў сваёй творчай дзейнасці надавалі сачыненням духоўнай тэматыкі, лічылі, што менавіта ў такіх творах захоўваюцца духоўныя традыцыі нацыі.

Першым і старэйшым беларускім кампазітарам, які мэтанакіравана звяртаўся да царкоўнай музыкі, быў М.Анцаў, вучань М.Рымскага-Корсакава. У спіс яго царкоўных твораў уваходзяць "Еўхарыстычны канон", "Достойно есть" і інш. Для царкоўных твораў М.Анцава характэрныя лірычнасць, чуллівасць інтанацый і разам з тым урачыстасць. Вядомы даследчык беларускай музыкі Г.дэ Пікарда параўноўвае царкоўныя хары М.Анцава з творамі П.Чайкоўскага, якія былі напісаны ў гэтым жанры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адзін з пачынальнікаў жанраў масавай песні, раманса, хору ў музычным мастацтве Савецкай Беларусі кампазітар А. Туранкоў (1886 – 1958) быў вядомы як выдатны меладыст, знаўца беларускай народнай песні і адначасова стваральнік мілагучных і сталых па стылі царкоўных хароў. Яго першыя творчыя вопыты ўключалі харавыя духоўныя сачыненні, напісаныя ў лепшых традыцыях праваслаўнага царкоўна-пеўчага харавога мастацтва: – “Хвали, душа моя, Господа”, ‘’Возвеличивает душа моя Господа” і інш. Яны прынеслі А.Туранкову шырокае прызнанне яшчэ ў дарэвалюцыйны перыяд.

У творы царкоўнай музыкі кампазітар уводзіў тэмы беларускіх народных песень. Так, харавая духоўная кампазіцыя “Херубікон”, прызначаная для камернага хору, пабудавана на мелодыі папулярнай народнай песні “Купалінка”, лірычна-вытанчаныя і шчырыя інтанацыі якой прыгожа стасуюцца са спеўнымі прыёмамі харавога многагалосся. Назавем яшчэ яго велікодны “Трапар”, “Кантакіён”, а таксама гімн “Днесь Христос в Вифлееме”, у якіх кампазітар адлюстроўваў свае духоўныя пачуцці.

Царкоўную музыку А.Туранкова характарызуюць інтанацыйная выразнасць, меладычнасць, напеўнасць, вытокі якіх караніліся ў лірычнасці беларускай народнай песні, базіраваліся на лірыка-паэтычнай, песеннай аснове і адлюстроўвалі характэрныя рысы паэтыкі кампазітара.

Імя М.Равенскага (1886–1953) на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў зусім не ўпаміналася на радзіме, хаця шырока прызнавалася за мяжой. Ён стаяў ля вытокаў прафесійнага музычнага мастацтва Беларусі, зрабіў важкі ўклад у станаўленне вакальных (песні, хары, вакальныя ансамблі) і музычна-драматычных (опера, аперэта) жанраў. Выдатны кампазітар, які стварыў шэраг нацыянальных па духу твораў, М.Равенскі з’яўляўся і таленавітым этнографам: ён вывучаў і апрацоўваў народныя песні і выкарыстоўваў іх у сваёй творчасці. Гэта “быў вельмі сімпатычны, вельмі спакойны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чалавек <…> Ён быў менскі, збіраў песні на Наваградчыне <…> быў выдатны царкоўны кампазітар, меў інструментальную камерную музыку” [1].

М.Равенскі, працуючы ў Навагрудку, зацікавіўся беларускай народнай песняй і сабраў у акрузе больш за пяцьсот песень [2]. Пазней, у “Маім жыццяпісе”, М.Равенскі апісаў сваё ўражанне ад беларускай песні: “…група жней завяла жніўную песню <…> Урэшце спявала ўсё поле <…> Усё разам тварыла неапісальную цудоўную сімфонію <…> У сваіх творах я спрабаваў перадаць некаторыя фрагменты з яе” [3]. Менавіта гэтыя словы кампазітара адлюстроўваюць таямніцу меладычнай асновы яго музыкі – мяккай, праніклёнай, мілагучнай і задушэўнай, яснай і простай, але эмацыянальна глыбокай, як народная песня.

Работа ў галіне царкоўнай музыкі пачынаецца для кампазітара ў гады нямецкай акупацыі радзімы, а пасля заканчэння вайны працягваецца на Захадзе. Менавіта там М.Равенскі, які з 1952 г. працаваў універсітэцкім капеланам беларускіх студэнтаў, перапрацоўвае для мужчынскага хору сваю вядомую “Літургію св. Яна Златавуста”, а таксама робіць аранжыроўку сінадальных кантаў, прызначаных для рукапалажэння святароў Шэўстанскага бенедыкцінскага кляштара ў Паўднёвай Бельгіі. У гэтым жа годзе выходзяць некалькі пласцінак з запісамі беларускіх народных песень у апрацоўцы М.Равенскага і рэлігійных твораў яго ж сачынення. Кампазітар неаднаразова адзначаў, што беларускую песню “можна смела ставіць на адно з першых месцаў у сусветнай народна-творчай літаратуры” [4] і тым самым пацвердзіў, што яго творчасць заўсёды падпітвалася фальклорнымі інтанацыямі, была першапачаткова песеннай, вакальнай па паходжанні і глыбока нацыянальнай па характары.

Сутнасць прыроды музычнага мыслення М.Равенскага мае чыста вакальнае паходжанне. Ён належыць да тых творцаў, чый “музычны почырк” пазнаецца амаль адразу,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беспамылкова і ў чыёй музыцы індывідуальнае, аўтарскае зліваецца з агульнанародным у самым глыбокім сэнсе гэтага слова, калі "народнае" фарміруе "генетычны код творцы, яго нацыянальны дух" [5] і надае яго творам нацыянальную афарбаванасць і напеўную меладычнасць. Трэба дадаць, што харавыя творы М.Равенскага – гэта "шырокія музычныя палотны <…> якія дазваляюць гаварыць аб імкненні аўтара сімфанізаваць харавую фактуру, надаць ёй тую логіку і дынаміку, якія ўласцівыя вышэйшаму дасягненню музычнай архітэктонікі – сімфоніі" [6].

Не выпадкова, што фальклорныя матывы знайшлі ўвасабленне і ў невялікіх царкоўных творах М.Равенскага, змешчаных у зборніку "Літургія", а ў яго "Херувімскай № 2" увогуле цытуецца народная песня "Ці свет, ці світае", прафесійна апрацаваная кампазітарам. М.Равенскі стварае і цудоўны хор "Верую" для кантральта сола і змешанага хору, і хары на тэксты царкоўных малітваў "Отче наш", "Достойно есть", сачыняе харавы канцэрт "Слава в вышних Богу". Аб выдатным харавым майстэрстве М.Равенскага сведчыць і папулярны гімн "О Божа Усеўладны", які выконваўся разам з іншымі свецкімі і духоўнымі творамі кампазітара Лювенскім студэнцкім хорам пад яго кіраўніцтвам [7].

Высокапрафесійныя царкоўныя хары М.Равенскага "Канон", "Достойно есть" (1943) з'яўляюцца выдатнымі ўзорамі спалучэння глыбокай духоўнасці, лірычнасці, эмацыянальнасці з багаццем і разнастайнасцю народна-песенных інтанацый. Гэта, несумненна, дазваляе паставіць М.Равенскага ў адзіны рад з выдатнымі стваральнікамі духоўнай харавой музыкі – рускімі кампазітарамі XVIII ст. М.Беразоўскім і Д.Бартнянскім, на фарміраванне харавога стылю якіх аказвала непасрэднае ўздзеянне мілагучнасць украінскага песеннага меласу. Так і царкоўная музыка М.Равенскага – "сапраўды духоўная музыка харальнага складу, строгая і стрыманая па стылі, наскрозь прасякнутая рэлігійным пачуццём" [8]. Трэба зазначыць, што менавіта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творы царкоўнай музыкі становяцца носьбітамі ўсечалавечых духоўных каштоўнасцей.

Глыбока нацыянальная па характары і змесце творчасць М.Равенскага дазваляе далучыць кампазітара да сапраўды народных творцаў; яго харавыя сачыненні прасякнуты паэтычнасцю і шчырасцю народнага мастацтва. Нездарма таленавітага і натхнёнага народнага майстра У.Дубоўка называў "музыкай-кампазітарам" і прылічаў да "патэнцыяльных узвышэнцаў у музыцы" [9], тым самым даючы творчасці М.Равенскага найвышэйшую ацэнку.

Сярод кампазітараў, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё сучаснага беларускага музычнага мастацтва, Мікола Куліковіч-Шчаглоў (1897–1969) займае асобнае месца. Ён выдатны музыкант, таленавіты кампазітар, прафесар, дырыжор хароў і аркестраў, піяніст, рэжысёр-пастаноўшчык музычна-драматычных твораў, навуковец, фальклярыст, даследчык гісторыі беларускага музычнага мастацтва і нацыянальнага музычнага фальклору. Творчасць М.Куліковіча падзяляецца на два перыяды. У першым (даваенным) ён, член Саюза савецкіх кампазітараў БССР з 1938 г., быў вядомым, папулярным аўтарам, высока і станоўча ацэньваўся савецкай музычнай крытыкай. У другім (ваенным і пасляваенным) перыядзе М.Куліковіч — гэта знакаміты на Захадзе стваральнік духоўнай царкоўнай музыкі.

Вялікае ўздзеянне на фарміраванне харавога стылю М.Куліковіча аказалі яго настаўнікі. Творчая школа, якую прайшоў М.Куліковіч у выдатных педагогаў А.Кастальскага і М.Іпалітава-Іванава, майстроў харавога і опернага мастацтва, знаўцаў музычнага фальклору, пазней вызначыла прыярытэтны кірунак творчасці іх вучня: кампазітар застаўся прыхільнікам вакальна-харавых традыцый у музыцы, але падыходзіў да гэтага па-наватарскі, выкарыстоўваючы ў духоўных кампазіцыях інтанацыі беларускага музычнага фальклору (у замежны перыяд ім



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

было апрацавана і гарманізавана больш за 600 песень). Гэта было звязана са спробай “глыбока і ўдумліва падыходзіць да захавання ў мастацкіх творах своеасаблівасцей беларускага каларыту” [10].

Музычная мова харавых царкоўных твораў М.Куліковіча (“Літургія св. Яна Хрызастома” і “Усяночная”, абедзве 1948 г.) надзвычай меладычная і выразная, песенная ў сваёй аснове, нацыянальна афарбаваная, што сведчыць аб дасканалым веданні кампазітарам народнай музыкі, яе асаблівасцей, адчуванні яе мелодыка-інтанацыйных нюансаў. У вышэйназваных харах выкарыстаны папеўкі беларускіх народных песень.

Выдатны знаўца фальклору М.Куліковіч у арыгінальных асабістых рэлігійных кампазіцыях спрабаваў аб’яднаць характэрныя асаблівасці народнай песні з кананізаванымі многагалоснымі царкоўнымі песнапеннямі і тым самым імкнуўся аднавіць традыцыі беларускай царкоўнай музыкі. У харах без суправаджэння: “Літургіі” (першая царкоўная кампазіцыя М.Куліковіча), “Достойно есть, Рождество твое”, “Христос Боже наш” (1942 – 1943), ва “Усяночнай”, “Літургіі св. Яна Златавуста” (1948), “Велікодным каноне”, ‘’Милости мира”, ‘’Тебе поем” і іншых – кампазітар абапіраўся на беларускі, рускі і ўкраінскі нацыянальны мелас, спалучаючы народна-песенныя інтанацыі з выдатным веданнем кампазіцыйнай тэхнікі і добрай агульнатэарэтычнай адукаванасцю. М.Куліковіч імкнуўся ідэнтыфікаваць сваё кампазітарскае пісьмо з народна-песеннымі і царкоўна-пеўчымі музычна-моўнымі элементамі ў апрацоўках духоўных твораў у традыцыях народнай музыкі. Гэта знайшло ўвасабленне, напрыклад, у апрацоўцы песень XVI–XVIII стст. з беларускага зборніка “Ірмалагіён”, зробленых кампазітарам у 1959 г.

Харавое пісьмо М.Куліковіча абапіралася таксама і на дасягненні яго папярэднікаў – кампазітараў канца XIX – пачатку XX ст.: П.Чайкоўскага, А.Кастальскага,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

С.Рахманінава і іншых — у галіне царкоўна-пеўчага мастацтва. У харавой фактуры царкоўных хароў М.Куліковіч выкарыстоўвае прыёмы імітацыйна-падгалосачнай поліфаніі разам са строгай гарманічнай вертыкаллю харавога гучання, з выдзяленнем вядучага голасу, у якім праводзіцца галоўны песенна-тэматычны (часцей за ўсё фальклорны) элемент. Па словах сучаснага даследчыка, М.Куліковіч "...пісаў цэлыя літургіі, заснаваныя на народных тэмах, і гарманізаваў мноства старых беларускіх напеваў", якія сёння гучаць "не горш за Рахманінава" [11].

Царкоўныя харавыя творы М.Куліковіча пасля яго смерці былі выдадзены ў замежжы (Лондане) у шэрагу зборнікаў царкоўнай музыкі – "Беларускі царкоўны спеўнік" (1979), "Беларускі духоўны спеўнік" (1989), "Беларускі царкоўны спеўнік – 2" (1991). Гэтыя зборнікі твораў "прынеслі Куліковічу славу аднаго з найвялікшых майстроў еўрапейскай царкоўнай музыкі".

Увогуле творчасць М.Куліковіча ўяўляе яркую старонку ў гісторыі прафесійнага беларускага музычнага мастацтва, а яго дасягненні ў галіне царкоўнай музыкі – значны ўклад у сусветную рэлігійную музычную літаратуру. М.Куліковіч – "цікавы і самабытны мастак, які прыцягвае да сябе найперш выразнай нацыянальнай адметнасцю, пошукамі нацыянальнай музычнай мовы і стылю" [12] і, дададзім, беларускай арыентаванасцю яго музычнай спадчыны.

Як справядліва адзначаў В.Ластоўскі, да беларускай мастацкай культуры належаць"усе творы сыноў зямлі і народу нашага, нягледзячы на тое, якой мовай і дзе яны тварылі", бо без гэтага карціна развіцця нацыянальнай культуры Беларусі не можа быць поўнай. Таму царкоўная музыка, створаная ў другой чвэрці XX ст., сёння адна з асноватворных галін спадчыны беларускіх кампазітараў. Менавіта ў творах царкоўнай музыкі захоўваюцца духоўныя традыцыі айчыннага мастацтва, а аўтары рэлігійных хароў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

успрымаюцца як першапраходцы ў фарміраванні асобных духоўных жанраў.

---

*1. Пікарда Г.* Інтэрв'ю // Літаратура і мастацтва. — 1992. — 27 ліст.

2. З дзяцінства М.Равінскі быў адораны музычна. Прыкладна з дзевяцігадовага ўзросту пачаў спяваць у хоры Мінскага кафедральнага сабора і выдатна іграў на скрыпцы, што і вызначыла яго далейшы лёс. У 1914 г. (па звестках А.Карповіча, сябра М.Равенскага) ён скончыў трохгадовыя рэгенцкія курсы ў Маскве, пасля чаго пачаў працаваць настаўнікам спеваў, а потым — кіраўніком царкоўнага хору ў Навагрудку.

3. Цыт. па: *Чаркасава Д.* Альфа і амега яго жыцця: беларускі кампазітар Мікола Равенскі // Полымя. — 1992. — № 12. — С. 177.

4. Там жа. — С. 178.

*5. Конан У.* Эстэтычныя погляды Вацлава Ластоўскага // Беларусіка=Albaruthenica. Кн. 4 / Рэд. В.Рагойша, Г.Цыкун, З.Шыбека. — Мн., 1995. — С. 248.

6. Цыт. па: *Марціновіч А.* Беларусі — "ціхой і ветлай": кампазітар М.Равенскі: старонкі жыцця і творчасці // Мастацтва. — 1993. — № 8. — С. 20.

7. Па словах М.Равенскага, усе выступленні "адбываліся з вялікім поспехам не толькі ў Бельгіі, але і ў Парыжы".

8. Цыт. па: *Марціновіч А.* Назв. выданне. — С. 20.

9. Цыт. па: *Мдзівані Т., Сергіенка Р.* Кампазітары Беларусі. — Мн., 1997. — С. 381.

*10. Калубовіч А.* Крокі гісторыі: даследаванні, артыкулы, успаміны. — Беласток; Вільня; Мінск, 1993. — С. 164.

*11. Пікарда Г.* Інтэрв'ю // Літаратура і мастацтва. — 1992. — 27 ліст.

*12. Сергіенка Р.* Знаходкі ў архіўных сховішчах // Мастацтва. — 1992. — № 11. — С. 58.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ